# Ведамасці

Гарадская газета Гродна · № 6 · 21 студзеня 2008


Шок

*Примерно 30 гродненских предпринимателей участвовали 10 января в митинге в Минске.*

# Отпускники

**Закрытые киоски на остановках, неработающие шиномонтажи, редкие «маршрутки», запертые ряды торговых боксов и пустые с нового года прилавки на рынках «Корона», Центральный, Южный - лидеры предпринимательских движений называют это забастовкой. Протест направлен на отмену указа № 760, запретившего ИП нанимать на работу кого-то кроме близких родственников. Городские власти утверждают, что те мелкие бизнесмены, кто не работает, стараются выполнить указ № 760 и заняты перерегистрацией в ЧУП.**




**Перед окончанием акции протеста 10 января, ее участники назначили новый митинг – 21 января. Это понедельник, выходной для рынков день.**

## 30 протестующих

Точно известно, что за отмену президентского указа № 760 борются примерно 30 гродненских бизнесменов – именно столько наших земляков, по оценке лидера стачкома предпринимателей Валерия Левоневского, участвовали в несанкционированном митинге в Минске 10 января.

Втрое больше гродненских предпринимателей – пошли в тот же день регистрироваться в ЧУПы.

***«95 человек подали заявления на перерегистрацию в ЧУП в администрации Ленинского и Октябрьского районов только за полдня!*** - рассказали «Ведамасцям» в гродненском горисполкоме. – ***Так что это дело 10 -14 дней – и ситуация поправится».***

## 10 января

В день митинга все рынки Гродно работали. По оценке «Ведамасцяў» только около половины торговых мест были закрыты на «Короне» и на минирынках, примерно 80% - на рынке Южном и только около 20% - на Центральном рынке.

***«Он сейчас регистрирует фирму, чтобы нанимать работников: у него же 18 боксов. Скоро он откроется»,*** - пожилая предпринимательница, торгующая обувью на Центральном рынке, объясняет, почему владелец соседнего павильона закрыл торговую точку. На закрытых боксах - объявления «Отпуск». Объявлений о забастовке нет.

***«Предприниматели оплатили аренду торговых мест. Никаких петиций или заявлений о забастовке нам никто не подавал»,*** - объясняют в горисполкоме.

***«Активисты сами рекомендовали предпринимателям оформлять отпуска, чтобы избежать различных санкций»,*** - объясняет Валерий Левоневский.

***«А почему я должен бастовать?!*** - говорит мужчина средних лет из павильона с одеждой. – ***А меня все равно этот 760 указ не касается, мы семьей работаем! Выйти на улицу? Ну это если уж совсем гайки закрутят, так что вообще никакой возможности работать не будет».***

***«Ну не знаю… Никто же не сказал: «с завтрашнего дня бастуем и все! Нет, наверное, такого человека, которого все бы послушали…»,*** - объясняет свое неучастие в протесте предпринимательница.

***«Предприниматели никогда и не были «монолитом». Они – срез общества,*** - говорит Левоневский. – ***Но все-таки, никакая другая профессиональная или социальная группа не вышла отстаивать свои права, хотя произошла отмена льгот, например. А предприниматели - вышли».***

## Минск

10 января в Минске около 1,5 тысяч белорусских предпринимателей провели митинг протеста с требованием отмены указа № 760. Они прошли колонной от пл. Октябрьской до пл. Независимости, перекрыли движение транспорта напротив Дома правительства. Протест длился с полудня до 17 часов.

К митингующим не вышел никто из госчиновников – ни из Администрации президента, ни из Совмина. Более 40 участников акции были задержаны милицией и осуждены минскими судами на административный арест сроками от 15 до 20 суток

## Кто проиграл?

***«Указ 760 никто не отменит»,*** – спокойно комментируют чиновники различных уровней.

***«Но мы не проиграли, - считает Левоневский. – Главный результат: произошла массовая утрата доверия к властям у огромного числа людей. Ведь в масштабах республики эта ситуация коснулась не только 200 тысяч ИП, но и наёмных работников и их семьи – это примерно 500-600 тысяч человек, которых обидело и озлобило государство. Еще 2 года назад предприниматели дистанцировались от политических лозунгов – а теперь даже БТ показало, как 10 января они скандировали: «Свободу политзаключённым!» Идет нормальный рост общества, его».***

**«Ведамасці»**

Смех

# Слёзы міністра

***"…У меня наворачивались слезы, когда я смотрел на своих сотрудников, в которых плевали, которых били и делали с ними, что хотели"*, - так пра акцыю пратэста прадпрымальнікаў выказаўся на прэс-канферэнцыі міністр унутраных спраў Беларусі Уладзімер Навумаў.**

У Беларусі дэманстранты не першы раз крыўдзяць міліцыянтаў. Яшчэ 25 сакавіка 2006 года да зубоў узброены сцягамі, і кветкамі натоўп каля метро "Нёміга" цынічна напаў на маладых хлопцаў са спецпадраздзялення "Алмаз". Байцы ў чорных касках спакойна стаялі патройным ланцугом і стукалі дубінкамі па шчытах - а распаясаўшыся натоўп спыніўся прыкладна ў 40 метрах ад іх і выкрыкваў антыдзяржаўныя лозунгі "Жыве Беларусь" ды "Свабоду". Байцы "Алмазу" былі вымушаныя ўжыць дубінкі ды дымавыя шашкі. "Адмарозкі" жорстка пакалечылі дзевяцерых маладзенькіх байцоў. Драпіны на калене, на ілбе, на руцэ – гэтыя шакуючыя кадры хлопцаў з "Алмазу" паказалі ўсе беларускія тэлеканалы.

10 студзеня па факце "масавых беспарадкаў" у Мінску была ўзбуджаная крымінальная справа.

**"Ведамасці"**



## Комментарий

**Александр Милинкевич:**

**«Будьте уверены: сегодня из бизнеса выброшен ваш сосед - уже завтра на его месте окажетесь вы. Ведь власти не раз заявили, что дают вам один год. Потому помните – ваша сила в единстве. Мы поддерживаем вас в вашей борьбе за право спокойно и честно работать. Мы добиваемся кардинального улучшения условий деятельности малого бизнеса – основы процветания государства!»**

# Аўтуховіч на волі

**У пятніцу 18 студзеня з менскай калоніі №1 да хаты вярнуўся палітзняволены, ваўкавыскі прадпрымальнік Мікалай Аўтуховіч.**

За кратамі ён прабыў два гады, цяпер яму змененая мера пакарання - на папраўчыя працы па месцы пражывання.

Для Аўтуховіча вызваленне было нечаканым і імклівым. Яшчэ зранку палітвязень нічога не падазраваў, а пасля абеду ў калонію прыехалі пракурор і суддзя - і вынеслі рашэнне пра змену пакарання для Аўтуховіча. Вызваленне было аформленае цягам 15 хвілінаў. ***"Шэсць ахоўнікаў мяне літаральна выпхнулі за вароты калоніі!*** - расказвае Аўтуховіч. **– *Добра, што якраз у гэты каля варотаў былі на ўласнай машыне людзі з Ваўкавыска - прыязджалі на спатканне да сваяка. Яны мяне і прывезлі да хаты".***

Нагадаем, Мікалай Аўтуховіч быў асуджаны ў 2006 годзе да 3,5 год пазбаўлення волі па абвінавачанню ў падатковым парушэнні. Праваабарончыя арганізацыі прызналі Аўтуховіча палітвязнем, таму што рэальнай прычынай яго пераследу стала змаганне прадпрымальніка з карупцыяй у органах улады рэгіёну.

"Вяртацца ў бізнес? На сённяшні момант у гэтым няма сэнсу, - гаворыць Аўтуховіч. - Трэба вырашаць іншыя пытанні, каб такія людзі, як я, маглі свабодна займацца бізнесам. Я ўжо ў палітыцы, мне няма куды адступаць. У нашай краіне кожны, хто незадаволены нечым робіцца палітыкам."

**Раман Суліма**

# Галадоўка

**У сухотным шпіталі, што ў вёсцы Наваельня пад Дзятлавам, каля 150 пацыентаў правялі галадоўку.**

Хворыя пратэставалі супраць кепскага харчавання, адсутнасці гарачай вады, і таго, што іх не выпускаюць за тэрыторыю шпіталя, нягледзячы на тое, што пацыенты лечацца тут добраахвотна.

***«У мяне двое дзяцей. Я прыехала сюды добраахвотна. А яны тут міліцэйскі пост паставілі. Я ў калоніі знаходжуся ці дзе?!*** - гаворыць пацыентка Натальля Рагалевіч - ***У шапіку ў нас няма нават пракладак. Тэрыторыя шпіталю – гэта кола, у якім склады, гараж і крыху маленькіх дрэваў і кусты. Дзе тут - па асфальце гуляць?!"***

Галоўны ўрач шпіталя Мечыслаў Доўгань пагражаў выклікаць АМАП. Пасля сутак галадоўкі хворыя былі вымушаныя спыніць пратэст.

**Радыё Свабода**

*Настаўнікам гродзенскіх школ прапанавалі згадзіцца са скарачэннем працоўнага адпачынку.*

# "Адцяпаныя" дні

**Кіраўніцтва гродзенскіх школ прапанавала настаўнікам падпісаць паперы аб тым, што яны інфарманаваныя пра скарачэнне летняга адпачынку з 56 да 24 дзён. Пры гэтым дакумент, які прадугледжвае скарачэнне адпачынкаў, яшчэ не ўступіў у сілу.**

***"Дырэктар выклікаў кожнага настаўніка асобна і прасіў падпісаць паперу, што мы ведаем пра ўнясенне зменаў у працоўнае заканадаўства,*** - расказвае на ўмовах ананімнасці настаўніца адной з гродзенскіх школ.




Фота: photo.bymedia.net

**Калі настаўнікаў адправяць у адпачынкі за свой кошт - яны будуць масава сыходзіць з працы**

Паводле сённяшняй рэдакцыі Працоўнага Кодэкса Рэспублікі Беларусь школьныя настаўнікі, як і іншыя катэгоры педагогаў, маюць права на 56 дзён адпачынку.

Толькі 26 студзеня чакаецца ўступленне ў сілу новага Працоўнага Кодэкса, у праекце якога тэрмін мінімальнага працоўнага адпачынку вызначаецца ў 24 дні.

***"Пасля таго, як калектыў абурыўся, дырэктар у настаўніцкай нават вывесіў аб'яву, маўляў: "не распаўсюджвайце плётак, дакладнай інфармацыі пакуль няма",*** - расказвае настаўніца.

Праект новага Кодэксу выключае паняцце "асноўны падоўжаны адпачынак", але для асобных катэгорый работнікаў прадугледжана павелічэнне тэрмінаў. Ці ўвойдуць настаўнікі ў гэтую катэгорыю – будзе вядома пасля ўступлення закона ў сілу. Адпачынкі будуць скарочаныя работнікам адміністрацый школ, псіхолагам і сацыяльным педагогам.

Настаўнікі не выключаюць, што кіраўніцтва сістэмы адукацыі задумала такую схему: аплочваць толькі 24 дні адпачынку, а астатні тэрмін – за ўласны кошт. Цяпер стаўка школьнага настаўніка ў сярэднім складае 150-200 даляраў.

Як пракаментавалі "Ведамасцям" у аддзеле адукацыі гродзенскага гарвыканкама, адпачынак настаўнікам сапраўды будзе скарочаны, але не да 24 а да 54 дзён:

***"У нас учора была нарада з удзела Людмілы Сяўко, дэпутата Савета Рэспублікі. Яна паведаміла, што настаўнікам толькі 2 дні дакладна "адцяпаюць",*** - паведаміла чыноўніца аддзела. - ***Але тым, каму адпачынак адлічваўся ад мінімальнага ўзроўню, будзе цяпер лепей. Вось у нас у аддзеле адукацыі раней базавы адпачынак быў 21 дзень, яшчэ набягала за ненармаваны працоўны дзень, за інтэнсіўную працу - атрымоўвалася дзесьці 30 дзён. А цяпер у нас будзе болей!"***

**Яніна Раманчук**

# Без маста




Фота: «Ведамасці»

**У першы дзень закрыцця маста ўтварыўся затор ад завода Карданных валаў да Філармоніі**

**Ад нуля гадзінаў 15 студзеня ў Гродне закрыты Стары мост. Ён павінен адчыніцца не раней як у ліпені. Увесь грамадскі транспарт праз Нёман перакіраваны на Румлёўскі ды Новы масты.**

Цікава, што дата закрыцця Старога маста на так званую "рэканструкцыю" за апошнія паўгады пераносілася некалькі разоў. Яшчэ ў жніўні на прэс-канферэнцыі дырэктар УП "Гродн агра мадзянпраект" Уладзімер Дзешка заявіў, што мост зачыняць у сярэдзіне кастрычніка.

Дакладную дату назваў гарвыканкам – 15 кастрычніка, і нават заранёў апублікаваў на сваім сайце ды ў мясцовых газетах змены ў раскладзе грамадскага транспарта. Але ў прызначаны дзень па масце спакойна працягваў хадзіць транспарт.

Мост зачыніліі 22 кастрычніка, але толькі для пешаходаў. Уладзімер Дзешка ды чыноўнікі гарвыканкама назвалі новы тэрмін закрыцця спыненне транспартнага руху па аб'екце – канец восені. Але восень прамінула без зменаў.

Прычыны такога адкладання тэрміну праектант патлумачыць "Ведамасцям" не здолеў: ***"Ніколі я не называў іншую дату!*** – сказаў Уладзімер Дзешка. – ***Асабіста я - не называў! А вось цяпер назваў! Вось я 14 снежня направіў ліст у гарвыканкам, ДАІ ды аўтобусны парк, і прызначыў дату закрыцця моста – 15 студзеня. Канчаткова!"***

Па словах Уладзімера Дзешкі, "афіцыйная здача" Старога маста прадугледжаная ў ліпені гэтага года ***"пасля афіцыйнай здачы – будзе дазволеная тэхнічная эксплуатацыя".***

Яшчэ ў жніўні Дзешка казаў, што кошт рэканструкцыі Старога маста складзе 12 мільярдаў рублёў. Гісторык Андрэй Вашкевіч лічыць, што дата закрыцця моста змянялася ў сувязі з тым, што тэрмінова ўносіліся змены ў праект рэканструкцыі:

***"Мяркую, што кошт "рэканструкцыі" за апошнія месяцы істотна змяніўся, таму 4 разы змянялася і дата яго закрыцця. Відавочна, што для пешаходаў Стары мост закрылі толькі для таго, каб апраўдаць будоўлю пантоннага моста, бо за 1,5 месяца ніякіх працаў, акрамя зваркі кансоляў па баках - не праводзілася. Шырыня моста за мяніцца неістотна, таму я не магу зразумець, як яны збіраюцца размясціць 4 паласы".***

**Віктар Казак**

## Хабар

# В больнице

**Заместитель главного врача одной из городских больниц Гродно подозревается в вымогательстве и получении взятки в размере 4,7 тысяч долларов.**

Замглавврача пока имеет статус «подозреваемого». Следствие ищет доказательства его вины в вымогательстве и получении взятки от должностного лица Несвижского завода медпрепаратов. Взятку, полагает следствие, он вымогал за благоприятное решение о переводе студентки одного из медицинских государственных университетов с платной по бюджетную форму обучения. Об этом сообщили в Управлении по борьбе с экономическими преступлениями МВД.

В отношении замглавврача возбуждено уголовное дело по ч.2. ст. 431 (вымогательство) Уголовного кодекса Беларуси.

# На таможне

**Старший инспектор Гродненской таможни осужден на 6,5 лет за получение взяток.**

В ходе судебного процесса было установлено, что старший инспектор отдела таможенного оформления и контроля таможенного поста «Брузги» Трайнович в 2005-2006 годах без проверки и оформления пропускал через границу машины с грузами.

За свои услуги он получил от 7 грузоперевозчиков 1270 долларов США и товаров на общую сумму 400 тыс. руб.

Судом Гродненского района Трайнович осужден по ч.2 ст.430 УК (получение взятки) к 6 годам и 6 месяцам лишения свободы с конфискацией имущества.

# Льготы возвратят

**Милиционерам планируется вернуть льготы на проезд в общественном транспорте.**

Министерство внутренних дел Беларуси готовит законопроект, согласно которому некоторые категории сотрудников милиции получат право бесплатного проезда в общественном транспорте. Форма реализации льготы пока обсуждается: это будет бесплатный проездной билет или специальный знак.

Планируется, что бесплатный проезд будет возвращен оперативникам, участковым, сотрудникам, которые ведут борьбу с «карманниками».

**Максим Барахтянский**

*Беларусы купляюць штотыдзень каля 2 мільёнаў латарэек. Хто выйграе ад гэтага латарэйнага бума?*

# Лататрон




Практычна кожны дарослы беларус хоць раз - ды купіў латарэю

**Пенсіянерка Марыя Іванаўна – распаўсюдніца латарэй. Штотыдзень на сваёй гандлёвай кропцы ў цэнтры Гродна яна прадае амаль 300 латарэйных білетаў. Такіх гандлёвых кропак у горадзе – каля 50, па Беларусі – каля двух тысячаў.**

***"Аднойчы мужчына купіў адразу 59 білетаў. Я запыталася: "Навошта столькі?" Ён адказаў: "Сыну на вяселле падару",*** – расказвае Марыя Іванаўна. – ***Сталыя пакупнікі ёсць: вельмі шмат пенсіянераў, студэнтаў захапляюцца латарэямі. Хтосьці выбірае па шчаслівых лічбах, хтосьці з закрытымі вачыма, а камусьці ўсё роўна які білет патрапіць".***

Латарэі прадаюцца яшчэ ў газетных шапіках, банках, паштовых аддзяленнях офісах сотавых аператараў, прадуктовых крамах, нават аптэках, іх размяркоўваюць прафсаюзы і бухгалтэрыі дзяржпрадпрыемстваў. Прынцып: бліжэй да пакупніка – болей продаж.

## Латарэйны бум

***"Каб лічыць латарэю паспяховай, трэба прадаць не меней за 700 тысячаў білетаў аднаго накладу"***, - распавяла начальнік рэкламна-інфармацыйнага аддзела РУП "Нацыянальныя спартовыя латарэі", адна з вядучых шоў "Суперлото" Алеся Рабухіна.

У сярэднім беларусы кожны тыдзень купляюць каля двух мільёнаў латарэйных білетаў розных фірмаў. А напярэдадні Калядаў ды Новага году – агульныя продажы латарэяў вырастаюць да двух з паловай мільёнаў штук. Гэта сапраўдны бум.

Найбольш папулярныя латарэі – тыя, што разыгрываюцца ў фармаце тэлешоў.

Бум пачаў набіраць абароты тры гады таму, калі на беларускі рынак, дзе панавала фірма "Беларускія латарэі" з тэлегульнёй "Ваше Лото", увайшоў другі арганізатар, фірма "Нацыянальныя спартыўныя латарэі" з шоў "Суперлото". За гэты час латарэйнай ліхаманкай перахварэў

### Даведка

**50% выручкі ад латарэяў ідзе ў прызавы фонд, адсюль выплочваюцца выйгрышы. Яшчэ прыкладна 20% - гэта выдаткі: друк білетаў, рэклама, тэлешоў, заробкі і пералічэнні ў соцстрах.**

**Прыбытак складае каля 15-18% і дзеліцца напалову паміж арганізатарамі і заснавальнікамі латарэяў.**

**Астатнія 13% - спачатку пералічваецца ў бюджэт, і адразу бюджэт цалкам вяртае гэтыя грошы заснавальніку латарэяў.**

**Такім чынам заснавальнікі латарэяў у Беларусі атрымоўваюць штотыдзень да 25% ад суммы рэалізацыі білетаў, гэта прыкладна 700 тысячаў даляраў.**

фактычна кожны дарослы беларус. І гродзенцы тут не сталі выключэннем: штотыдзень у горадзе і раёне прадаецца каля 160 тысячаў латарэйных білетаў.

## Шансаў амаль няма

Згодна статыстыцы, шанец выпадае ўладальніку кожнага 8-га латарэйнага білета, гэта значыць што кожны тыдзень выйграюць 250 тысячаў чалавек.

Але сапраўды буйныя выйгрышы - кшталту кватэры, машыны, ці сумы грошай больш за тысячу даляраў - у тыдзень выпадаюць не болей чым на 25 білетаў. Гэта ва ўсіх латарэях у Беларусі! А большасць гульцоў атрымоўвае суму, якая толькі кампенсуе кошт латарэйкі. Вось, напрыклад, вынікі апошніх розыгрышаў двух тэлешоў (глядзі табліцу).

## Гульня з дзяржавай

Беларусы трацяць на латарэі штотыдзень каля 6 мільярдаў рублёў, гэта прыкладна 2,8 мільёнаў даляраў. За месяц набягае каля 11 - 14 мільёнаў, за год - каля 140 мільёнаў даляраў.

У Беларусі усе латарэі належаць дзяржаве: "Вашо лото" –Упраўленню справамі прэзідэнта, "Суперлото" – Міністэрству спорта і турызма. Ёсць яшчэ каля 40 латарэяў, напрыклад Гродзенскі гарвыканкам заснаваў латарэю "Гарадніца", нават Міністэрства ўнутраных спраў мае сваю латарэю, з самай доўгай назвай: "Служа закону – служим народу".

Латарэйныя выйгрышы ў Беларусі не абкладаюцца падаткамі. Але падаткаў з прыбытку не плацяць таксама ні фірмы-арганізатары, ні ўстановы-заснавальнікі латарэяў.

## Кепская інвестыцыя

Па меркаванню экспертаў, людзі інвестуюць у фартуну тады, калі не могуць іншым спосабам інвеставаць у сваю будучыню:

***"Грамадства адклікаецца на стымулы, якія дае дзяржава. Беларускія ўлады не кажуць насельніцтву: "Укладвайце грошы ў адукацыю, у сваіх дзяцей, ва ўласны бізнес" – і не ствараюць для гэтага ўмовы,*** - лічыць эканаміст Яраслаў Раманчук. – ***Наадварот: "Купляйце латарэі і за 5 капеек атрымаеце мільён" – вось што чуюць беларусы. І нічога не зменіцца, пакуль у масавай свядомасці людзей не з'явіцца такога разумення: як яны заінвестуюць свае грошы, сваю працу, свой час цяпер - так і будуць жыць надалей".***

**Раман Суліма**

| "Ваше лото" | "Суперлото" |
|---|---|
| Наклад 307. Насельніцтва купіла 419 617 білетаў. | Наклад 149. Насельніцтва купіла 1 516 498 білетаў. |
| Ад 10 мільёнаў да 17 мільёнаў | Ад 98 мільёнаў рублёў да кватэры |
| 5 білетаў | 4 білетаў |
| Ад 1 мільёна да 1 800 тысяч | Ад 2 мільёнаў да 11 мільёнаў |
| 18 білетаў | 15 білетаў |
| Да 6 тысяч рублёў | Да 6200 рублёў |
| 71 тыс. | 181 тыс. |

# Тарифы скачут

**Не менее 20 долларов из расчета на стандартную 2-комнатную квартиру должны подорожать коммунальные услуги для населения. Это предложение Министерства экономики Беларуси.**

В интервью «Ведамасцям» экономист Михаил Залесский высказал предположение, что это будет не единственное повышение коммунальных тарифов:

***«Со второго квартала ожидается новое резкое повышение цены на газ для Беларуси – поэтому население должно подготовиться ко второму скачку «коммуналки». Я прогнозирую его на август-сентябрь».***

Согласно российско-белорусскому соглашению, цена на газ в 119 долларов за 1 тыс. кубометров действует для Беларуси только до апреля. Далее цена на газ составит примерно 125 долларов за 1 тыс кубометров.

Население Беларуси оплачивает газ по ценам намного выше, чем государство. В 2007 году, когда цена газа для Беларуси составляла 100 долларов за 1тыс кубометров, население платило государству из расчета 120 долларов за тыс кубометров.

# За неплатежи



**Штраф от 350 до 1050 тысяч рублей грозит жителям Октябрьского района Гродно за 5-дневную просрочку в оплате коммунальных услуг.**

О применении такой меры договорились УЖРЭП, суд и РОВД Октябрьского района Гродно. Как пояснили «Ведамасцям» в УЖРЭП, штраф неплательщикам предусмотрен ст 21.16 Административного кодекса «Нарушение правил пользования жилым помещением».

***«В суды мы пока не подавали, но кандидаты у нас есть. В первую очередь эта статья будет применяться к тем, кто с опозданием оплачивает коммунальные услуги из месяца в месяц»,*** - сообщили в УЖРЭП.

Если имущество неплательщика будет конфисковываться через суд – коммунальщики обязуются предоставить для вывоза вещей свой транспорт и помещение для хранения. Имущество неплательщиков будет продаваться через госторговлю.

# Безрыбье

**Белорусы почти не едят рыбы.**

По 14 килограммов на каждого жителя Беларуси, всего 130 тысяч тонн – столько морской рыбы было импортировано в республику в прошлом году. Собственной озерной и речной рыбы в Беларуси произведено и того меньше 13 тысяч тонн – это по грубому подсчету около 1,4 килограмма на человека.

Причина этого – резкое снижение количества фирм-импортеров. От декабря 2005 года в Беларуси фирмы-импортеры на основе конкурса устанавливает Управление делами президента. В результате, если 3 года назад рыбу в Беларусь ввозили около 140 фирм, то от конца прошлого года – только 29.

**Максим Барахтянский**

# Александр Милинкевич:
## «Мы – за справедливые выборы»


Фота: «Ведамасці»

**Через несколько месяцев нас ожидает очередная избирательная кампания – выборы депутатов белорусского парламента. Уверенно можно говорить, что выборы не будут открытыми и свободными. Не менее уверенно можно говорить, что новый состав Палаты Представителей будет целиком подчинен исполнительной власти.**

Безраздельная власть Лукашенко установилась еще в 1996 году и весь этот период только распространялась по всей горизонтали общественного устройства. Первое, что уничтожил Лукашенко, был Верховный Совет, единственная альтернатива его единоличной власти. Не для того он разрушил парламентаризм и держит оппозицию в условиях фактического подполья, чтобы позволять ей вести публичную политическую деятельность.

Сегодня институт парламентаризма в Беларуси отсутствует как таковой. Номенклатурные депутаты Палаты Представителей не имеют никакой реальной власти для влияния на жизнь в государстве. Они не разрабатывают и не изменяют бюджет, они его только утверждают. Они не самостоятельны в законотворческом процессе. Они не участвуют в формировании правительства и не могут независимо решить даже вопрос избрания своего спикера.

Как следствие, в Беларуси избирателей практически не интересует, кто будет в этом так называемом парламенте. Да и манипуляциии с результатом выборов в Беларуси практически не скрываются.

Во-первых такой пример: ЦИК Украины для того, чтобы подвести окончательные итоги последних парламентских выборов понадобилось три дня. Несколько дней подводятся итоги выборов в США, и даже в России. Для нашего Центризбиркома это - вечность. У нас официальные результаты оповещаются через пару часов. Откуда такие белорусские скорости при подсчетах? Все просто: единственное, чем заняты наши участковые комиссии – это оформление протоколов согласно процентам, продиктованным местными администрациями.

Во-вторых, независимые наблюдатели на выборах в Беларуси вообще не видят бюллетеней – ни при выдаче, ни при подсчете голосов. Избирательные комиссии формируются властью, без участия партий и представителей гражданского общества. И исключительно из лояльных людей – зачастую имеющих сомнительный «опыт проведения выборов» еще с советских времен.

В-третьих, отсутствует открытость в представлении позиций. В соседних государствах накануне выборов на рекламных щитах - портреты кандидатов, листовки распространяются в любом публично значимом месте города, в радио- и телеэфирах проводятся открытые дебаты между кандидатами. Красочная агитационная продукция партий и кандидатов - в свободном доступе для любого интересующегося выборами и в любом объеме. Когда независимые наблюдатели и журналисты приезжают в Беларусь, они задаются вопросом: тут действительно идут выборы? Превалирует одна позиция, одна точка зрения - и все доступные СМИ нацелены на ее представление.

К сожалению, с нынешней практикой проведения выборов у демократических сил Беларуси шансов на то, чтобы пройти в «палатку» фактически нет. Но Рух «За Свабоду» будет проводить кампании «За справедливые выборы».

Проблема находится не только в плоскости отдельной избирательной кампании. Для восстановления и развития института парламентаризма, парламентской культуры в обществе необходимы время, реформы, и политическая воля. А на сегодняшнем этапе - широкое информирование населения, активизация социальных групп, программа последовательных шагов по изменению ситуации.

ГАРАДЗЕНСКАЯ БІБЛІЯТЭКА

# Магдэбургская Гародня

**Першая кніга з серыі “Гарадзенская бібліятэка” неўзабаве пабачыць свет. Праца “Магдэбургская Гародня” падрыхтавана гісторыкам Юрам Гардзеевым.**




Фрагмент з кнігі:

***“... Як правіла, падоўжаны будынак карчмы складаўся з дзвюх частак: жылой ды гаспадарчай. У тарцовых фасадах размяшчаліся ўезды ў стайні, якія знаходзіліся ўсярэдзіне. Падарожніка Ёгана Бярнулі, які наведаў Гародню ў 1777 г., моцна здзівіў выгляд наведанага заезду, у якім яму прыйшлося затрымацца. У сваім дзённіку ён занатаваў наступнае: „Вялікая і прыгожая новая карчма, якую мы знайшлі пасля вялікіх цяжкасцей, на першы погляд абяцала нам усялякія выгоды і магчымасць адпачынку, але, на жаль, мы трапілі ў чатыры нядаўна пафарбаваныя вільготныя сцены, дзе не было ні ложка, ні стала, ні крэсла, ні нават падваконня, на якім можна было б што-небудзь пакласці — так, зрэшты, усе пакоі; не было нават дзвярных замкоў, акрамя таго, уладальнік заезду (хаця і былі гэта немцы) увогуле дрэнна гаспадарыў у карчме. У сувязі з тым, што была нядзеля, шмат галоты сабралася тут, каб пабавіцца і патанцаваць...”***

У выдавецкіх планах Гродзенскага Руху «За Свабоду», які заснаваў серыю - таксама апошнія творы Аляксея Карпюка, успаміны Дануты Бічэль, публіцыстыка і дзённікі беларускага дзеяча 20-х гг. XX ст. Пятра Сеўрука, падручнік “Гродназнаўства”, аповеды вядомых гісторыкаў пра таямніцы каралеўскага гораду, гістарычныя нарысы Алеся Краўцэвіча, некалькі соцень лістоў перапіскі Васіля Быкава з Рыгорам Барадуліным (1960-2003) ды іншыя.

Выдавецкая серыя “Гарадзенская бібліятэка” будзе знаёміць з гісторыяй горада, свабоднай ад ідэалагічнай хлусні, з мастацкімі творамі і навуковымі працамі гродзенцаў, якія зрабілі значны унёсак у культуру беларускага народу і яго суседзяў.

Гродна заўсёды быў адным з цэнтраў культурнага жыцця ў Беларусі. Архітэктура Гродна і вольны дух яго жыхароў на працягу стагоддзяў стваралі атмасферу, у якой нараджаліся таленты.

“Гарадзенская бібліятэка” – гэта яшчэ адзін напамін гродзенцам, што лёс гораду ў іх руках, што толькі агульнымі намаганнямі мы здолеем перанесці ў XXI ст. непаўторнасць гістарычнага Гродна, зберагчы яго для нашчадкаў.

Серыя выдаецца пад патранатам лідэра Руху “За Свабоду” Аляксандра Мілінкевіча.

## “Свабоднае кіно”

**Серыю праглядаў дакументальных фільмаў прысвечаных барацьбе за незалежнасць, нацыянальную ідэнтычнасць і дэмакратыю ў розных краінах распачынае Гродзенскі Рух “За Свабоду”.**

“Свабоднае кіно” – у рамках гэтай кампаніі будуць паказаныя фільмы пра турмы для палітвязняў “народнай дэмакратыі” Кубы, пра сучасны стан Нагорнага Карабаха, Аўганістану, пра выніі Югаслаўскага канфлікту, маніпуляцыі масавай свядомасцю народа Сербіі, пра падаўленне дыктатуры ў Нігерыі, пра страчаны народ Тыбету і шмат іншых фільмаў.

Даты праглядаў будуць паведамляцца. Прыходзьце! Давайце вучыцца на чужых памылках – і рабіць меней уласных!

**Падпіска на “Ведамасці” цяпер і па пошце!**
**Каб атрымоўваць “Ведамасці” на сваю паштовую скрыню, пішыце:**
***230026 ГРОДНА, А/С 62***

**Гродзенскі Рух “За Свабоду” прымае таксама Вашыя заўвагі, прапановы, ідэі. Пішыце!**

**Падпісацца на электронны альбо папяровы варыянт “Ведамасцяў” можна таксама па адрасе:**
***Zasvabodu.hrodna@gmail.com***

Глядзі БЕЛСАТ tv BELSAT
**На спадарожніку Astra (Astra-19,2° E, палярызацыя H, частата 10773 МГц), а ўжо хутка і на Sirius.**
**Падрабязнасці на www.belsat.eu**

Выдаецца па ініцыятыве Гарадзенскага Руху «За Свабоду» Адрас рэдакцыі: г. Гродна, пл Тызенгаўза,1. Галоўны рэдактар Антоні Тызенгаўз Падпісана ў друк 21.01.2008.
Наклад адпаведна заканадаўству. Надрукавана на ўласным абсталяванні рэдактара.
Замовіць падпіску на электронную ці папяровую версію газеты «Ведамасці» можна па адрасе:
**230026 ГРОДНА, А/С 62**
**zasvabodu.hrodna@gmail.com**